**УДК 392:273.2(476.5)** **DOI 10.52928/2070-1608-2024-71-3-103-111**

# СТАРАВЕРСКІЯ АБШЧЫНЫ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1980-х – 2020-х гг.

***канд. гіст. навук, дац. У.Я. АЎСЕЙЧЫК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай)***
***ORCID: https://orcid.org/0000-0002-6433-0039***

*У артыкуле характарызуецца стан стараверскіх абшчын на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў другой палове 1980-х – 2020-х гг. У гэты перыяд вобласць з'яўлялася абсалютным лідарам па колькасці стараверскіх рэлігійных аб'яднанняў у краіне. У канфесійнай гісторыі Беларусі сярэдзіна 1980-х гг. адзначаецца ажыўленнем рэлігійнага жыцця, якое было выклікана мерапрыемствамі перабудовы. Аднак на дзейнасць стараверскіх аб'яднанняў вобласці гэтыя працэсы мала паўплывалі. У артыкуле выяўляюцца заканамернасці функцыянавання стараверскіх абшчын у рэгіёне ў другой палове 1980-х гг. Адзначаюцца асаблівасці дзяржаўна-канфесійных адносін у гэты перыяд. Больш істотныя змены ў рэлігійным ландшафце вобласці былі выкліканы атрыманнем Беларуссю незалежнасці і прыняццем новага заканадаўства, якое рэгламентавала дзейнасць рэлігійных абшчын. У працы паказаны працэс утварэння (рэгістрацыі) новых стараверскіх рэлігійных арганізацый у 1990-я гг., ахарактарызавана іх становішча ў 1990 – 2020-я гг., прааналізаваны колькасныя паказчыкі.*

***Ключавыя словы:*** *стараверы, рэлігійная абшчына, этнічная група, канфесія, Віцебская вобласць, дзяржаўна-канфесійныя адносіны.*

**Уводзіны.** Паўночнабеларускія землі з'яўляюцца адным з важнейшых цэнтраў стараверства ў межах краіны, гісторыя якога налічвае больш за тры стагоддзі. У рэгіёне былі сфарміраваны дзве зоны кампактнага рассялення стараверскага насельніцтва – на ўсходзе і на захадзе (гл. падрабязна: [1]). Як у мінулым, так і ў сучасны перыяд паўночная частка Беларусі па колькасці стараверскага насельніцтва і іх рэлігійных абшчын з'яўлялася лідарам у краіне. Аднак нягледзячы на гэта, стараверства на паўночнабеларускіх землях не знайшло належнага адлюстравання ў навуковых даследаваннях. І калі па гісторыі старавераў рэгіёна яшчэ маецца некаторая колькасць публікацый (гл. падрабязна: [2]), то функцыянаванне стараверскіх абшчын Віцебшчыны ў канцы XX – пачатку XXI ст. вучоныя абдзялілі ўвагай.

Неабходна адзначыць, што гісторыя стараверскіх рэлігійных аб'яднанняў другой паловы 1980-х – 2020-х гг. у Беларусі ўвогуле не з'яўлялася прадметам асобнага комплекснага даследавання. Не было сістэматызаваных прац і па асобных рэгіёнах (адміністрацыйных адзінках) Беларусі. У той жа час дадзеная праблема ўсё ж знайшла некаторае адлюстраванне ў шэрагу публікацый. Так, матэрыялы з паўночнага рэгіёна аб стане стараверства, зафіксаваныя ў другой палове 1980-х гг., былі прааналізаваны ў калектыўным даследаванні "Старообрядчество в Беларуси" (1992) [3]. У яе асобным раздзеле "Деятельность старообрядческих общин в Беларуси" [3, с. 43–56] разгледжаны некаторыя аспекты функцыянавання стараверскіх абшчын у другой палове 1980-х гг. Зусім сціслая інфармацыя аб стане стараверскіх рэлігійных арганізацый у Беларусі ў другой палове 1980-х – 1990-х гг. утрымліваецца ў выданні "Канфесіі на Беларусі" [4, с. 302, с. 334]. Магілёўскі даследчык В.У. Старасценка ў шэрагу артыкулаў прааналізаваў дынаміку колькасці стараверскіх абшчын у рэгіёне ў 2000-я гг. [5–6]. А этнолаг У. Іваноў у сваёй працы "Аб кабетах, якія "папуюць": аб ролі і месцы жанчынаў у рэлігійным жыцці стараверства Віцебшчыны" [7] закранаў некаторыя аспекты сучаснага функцыянавання стараверскіх абшчын ва Усходняй Віцебшчыне. Шэраг фактаў з гісторыі старавераў-паморцаў на беларускіх землях у канцы XX ст. прааналізаваў А.А. Безгадаў у артыкуле "Поморское древлеправославие в Белоруссии" (2002) [8].

Спробу абагульніць даныя аб сучасным стане стараверства ў Беларусі, у т.л. на тэрыторыі Віцебскай вобласці, зрабіла Т.І. Хурсан у навукова-папулярным выданні "Стараабраднікі Беларусі: мінулае і сучаснасць" (2020) [9]. Аднак інфармацыя, прадстаўленая ў яе публікацыі, аказалася даволі фрагментарнай і несістэмнай. Больш таго, у працы ўтрымліваецца шэраг недакладнасцей і памылак. Так, даследчыца "прыдумала" некалькі стараверскіх абшчын на тэрыторыі Віцебскай вобласці, якія тут ніколі не існавалі. Яна адзначыла, што "сучасныя працэсы ў грамадстве не маглі не адбіцца на жыцці стараабраднікаў. У гарадах з'яўляюцца новыя абшчыны і пашыраюцца існуючыя. Гэта датычыць Браслава, Глыбокага, Полацка, Віцебска, Барысава, Бабруйска, Гомеля, Пастаў, Мінска" [9, с. 36]. Але трэба заўважыць, што ні ў Глыбокім, ні ў Паставах стараверскія абшчыны на сучасным этапе не функцыянуюць. Далей яна піша, што "акрамя гэтага, у Беларусі дзейнічаюць наступныя абшчыны паморцаў: Браслаўскі раён – Браслаў, Булавішкі, Друя, Кірыліна, Мінкавічы, Мікалаюнцы, Відзы; Міёрскі раён – Дзісна, Кублішчына, Нівінікі; Шаркаўшчынскі раён – Германавічы, Раковце, Варонка; Глыбокскі раён – Глыбокае, Ластавічы; Пастаўскі раён – Апідомы, Паставы… " [9, с. 36–37]. І ў дадзеным фрагменце былі чамусці згаданыя стараверскія абшчыны ў Глыбокім і Паставах, якіх не існуе. Таксама аўтар "прыдумала" і абшчыну ў Дзісне, якой таксама ніколі не існавала і не існуе на сучасным этапе. У сваю чаргу, Т.І. Хурсан у гэтым выказванні не прыняла яшчэ адну абшчыну ў Браслаўскім раёне (в. Буеўшчына), а таксама няправільна ўказала шэраг назваў населеных пунктаў, дзе знаходзяцца цэнтры стараверскіх рэлігійных аб'яднанняў. Так, замест "Нівінікі" трэба "Ніўнікі", а замест "Раковце" – "Ракаўцы". Больш таго, ужо даволі працяглы час апошняя абшчына адміністрацыйна адносіцца да г.п. Шаркаўшчына. Даследчыца адзначае, што ў 2014 г. у Віцебскай вобласці было зарэгістравана 20 стараверскіх абшчын [9, с. 37]. У сваю чаргу ў рэальнасці на яе тэрыторыі ў гэты час іх было 18 (гл. ніжэй).

*Мэтай* дадзенага артыкула з'яўляецца характарыстыка стану стараверскіх абшчын з другой паловы 1980-х гг. па сучасны перыяд. У якасці *рэгіёна даследавання* выступае тэрыторыя Віцебскай вобласці ў яе сучасных адміністрацыйных межах. Аснову даследавання склалі матэрыялы Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці.

**Асноўная частка.** Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Паўночнай Беларусі налічвалася даволі значная колькасць стараверскіх абшчын. Па-ранейшаму яны былі сканцэнтраваны ў заходняй і ўсходняй частках Падзвіння. На ўсходзе рэгіёна дзейнасць многіх стараверскіх рэлігійных аб'яднанняў, якія былі зачынены ў 1920 – 1930-я гг., аднавілася яшчэ ў гады вайны. У пасляваенны перыяд у межах Віцебскай вобласці, якая ў той перыяд ахоплівала паўночна-ўсходнюю частку Беларусі, на 1947 г. афіцыйную рэгістрацыю атрымалі 16 стараверскіх рэлігійных аб'яднанняў. Аднак ужо з канца 1940-х гг. ажыццяўляецца зняцце з рэгістрацыі большасці з іх. У наступным легальную працу ў рэгіёне працягнулі толькі 2 стараверскія рэлігійныя аб'яднанні: у Віцебску і в. Светагорава Бешанковіцкага раёна [12, с. 81]. А ўжо ў 1968 г. абшчына ў Светагорава была знята з рэгістрацыі і спыніла сваю легальную дзейнасць [13, арк. 79, 83].

Адразу пасля Вялікай Айчыннай вайны ў паўночна-заходнім рэгіёне Беларусі (на той час, у межах Полацкай і Маладзечанскай абласцей) дзейнічала каля 30 рэлігійных аб'яднанняў старавераў. Аднак ў канцы 1940-х – першай палове 1950-х гг. афіцыйную рэгістрацыю прайшлі не ўсе з іх. А некаторыя з зарэгістраваных рэлігійных арганізацый у хуткім часе былі знятыя з афіцыйнага ўліку. Так, на 1955 г. у межах гэтага рэгіёна афіцыйна дзейнічала толькі 17 стараверскіх абшчын. У гэты час 16 з іх размяшчаліся на тэрыторыі Маладзечанскай вобласці, а 1 (у г. Полацку) з 1954 г. адміністрацыйна адносілася ўжо да Віцебскай вобласці [10, с. 91].

У 1960 г. Маладзечанская вобласць была ліквідавана, а яе раёны ўвайшлі ў склад Віцебскай, Мінскай і Гродзенскай абласцей. У выніку 13 стараверскіх абшчын, якія раней дзейнічалі на яе тэрыторыі (у вв. Апідамы, Кукляны, Ніўнікі, Кублішчына, Ластавічы, Ракаўцы, Германавічы, Варонка, Булавішкі, Мінкавічы, Мікалаюнцы, Кірыліна і пас. Відзы), апынулася ў Віцебскай вобласці, 2 (у пас. Свір і в. Масцішча) – у Мінскай, а 1 (у в. Стрыпішкі) – у Гродзенскай [10, с. 91]. Такім чынам, у межах Віцебскай вобласці на 1960 г. аказалася 16 стараверскіх рэлігійных аб'яднанняў[1]. Пасля зняцця з рэгістрацыі абшчын у Светагорава Бешанковіцкага раёна (1968 г.) і Мікалаюнцах Браслаўскага раёна (1969 г.; [14, арк. 68, 73]), іх стала 14.

На працягу 1970 – 1980-х гг. колькасць зарэгістраваных стараверскіх рэлігійных аб'яднанняў на тэрыторыі Віцебскай вобласці заставалася стабільнай. Такая ж колькасць (14) абшчын у вобласці фіксавалася ў 1974 г. [15, арк. 39]. На 1984 г. архіўныя дакументы таксама паведамляюць аб 14 зарэгістраваных стараверскіх рэлігійных аб'яднаннях на яе тэрыторыі [16, арк. 13–14]. На 1986 г. іх таксама налічвалася 14 [17, арк. 25]. Столькі ж іх было ў канцы 1980-х гг. Згодна з афіцыйнымі данымі, у 1988 г. па Віцебскай вобласці фіксавалася 14 стараверскіх абшчын, у якіх працавала 10 святароў [18, арк. 25]. На 01.01.1991 г. у межах вобласці таксама функцыянавала 14 зарэгістраваных рэлігійных аб'яднанняў старавераў [19, арк. 40].

У канфесійным плане усе зарэгістраваныя абшчыны адносіліся да паморскай царквы. Яшчэ ў 1950 – 1960-х гг. шэраг беспапоўскіх абшчын рэгіёна атаясамліваліся з федасееўцамі, што нават увасобілася ў іх назвах (гл. падрабязна: [10; 11]), але ў другой палове ХХ ст. усе яны перайшлі да паморскай царквы. Апошняй да паморскай традыцыі далучылася ў 1985 г. Віцебская абшчына старавераў-беспапоўцаў [8, с. 226]. Пры гэтым трэба адзначыць, што ў саміх абшчынах паморская традыцыя працягвала спалучацца з федасееўскай, а, як вынікае з матэрыялаў апытання духоўных настаўнікаў, нават на першым з'ездзе духоўных настаўнікаў беспапоўскіх абшчын Беларусі, які адбыўся ў 1998 г., востра дыскутавалася пытанне адносна афіцыйнага аднясення беспапоўскіх абшчын Беларусі. Толькі падчас гэтага з'езда дадзенае пытанне было канчаткова вырашана і абшчыны старавераў-беспапоўцаў Беларусі канчаткова сталі паморскімі.

Як вынікае з аналізу архіўных крыніц і матэрыялаў палявых даследаванняў, у пасляваенны перыяд у межах Віцебскай вобласці дзейнічалі і незарэгістраваныя групы вернікаў-старавераў. Так, яшчэ архіўныя крыніцы 1950–1960-х гг. паведамлялі, што ў рэгіёне па-ранейшаму працягвалі сваю дзейнасць рэлігійныя аб'яднанні старавераў, якія былі знятыя з афіцыйнай рэгістрацыі, або ўвогуле ў пасляваенны перыяд не былі зарэгістраваныя. Крыніцы паведамляюць аб дзейнасці груп вернікаў у Віцебску, на тэрыторыі сучаснага Шумілінскага, Чашніцкага, Браслаўскага, Пастаўскага раёнаў [10, с. 89, с. 91; 12, с. 81]. Аднак за перыяд 1960 – 1980-х гг. многія з іх спынілі сваю дзейнасць, а іх вернікі далучыліся да дзеючых (афіцыйна зарэгістраваных) рэлігійных аб'яднанняў. Пры гэтым неабходна адзначыць, што шэраг з гэтых абшчын працягвалі функцыянаваць нелегальна, без рэгістрацыі, яшчэ ў другой палове 1980-х гг. Архіўныя крыніцы і матэрыялы палявых даследаванняў сведчаць аб дзейнасці шэрагу з іх у Віцебску, Браслаўскім, Шумілінскім раёнах.

У пасляваенны перыяд у Віцебску, апроч абшчыны старавераў-беспапоўцаў, дзейнічала незарэгістраваная група старавераў-папоўцаў Белакрыніцкага сагласа. Яна аднавіла сваю дзейнасць яшчэ ў часы Вялікай Айчыннай вайны, але ў пасляваенны перыяд не атрымала афіцыйнай рэгістрацыі. У 1966 г. гэтая група вернікаў здзейсніла спробу яе атрымаць, аднак Віцебскі аблвыканкам адмовіў у яе просьбе [20, арк. 4, 6]. Нягледзячы на адмову, рэлігійная група працягвала сваю дзейнасць нелегальна, без рэгістрацыі. Новая спроба атрымаць афіцыйнае афармленне была прадпрынята ў канцы 1980-х гг. У 1988 г. была накіравана заява ў Віцебскі гарвыканкам з просьбай аб рэгістрацыі абшчыны старавераў-папоўцаў Белакрыніцкага сагласа. У 1989 г. гарвыканкам ухваліў

[1] Да 13 з былой Маладзечанскай вобласці дадаліся абшчыны ў Віцебску, Полацку і Светагорава, якія да 1960 г. знаходзіліся ў складзе Віцебскай вобласці.

гэту просьбу і хадайнічаў перад абласным выканкамам зацвердзіць рашэнне. У 1991 г. абшчына старавераў Белакрыніцкага сагласа была зарэгістравана [20, арк. 8, 12, 13].

Архіўныя крыніцы паведамляюць і аб "нелегальнай" дзейнасці ў сярэдзіне 1980-х гг. абшчын у Друі і Грыгараўшчыне Браслаўскага раёна. У гэтых населеных пунктах стараверскія рэлігійныя аб'яднанні перапынілі сваю легальную дзейнасць пасля Вялікай Айчыннай вайны [10], аднак працягвалі дзейнічаць "падпольна". Пра гэта сведчаць архіўныя крыніцы, а таксама матэрыялы палявых даследаванняў. У другой палове XX ст. у гэтых месцах адсутнічалі стараверскія храмы, а таму вернікі на службу збіраліся ў хатах. Спрыяў іх "нелегальнай" дзейнасці і той факт, што ў абшчынах стараверaў-беспапоўцаў узначальваў богаслужэнне і выконваў абрады духоўны настаўнік, які абіраўся вернікамі. У шэрагу выпадкаў, як сведчаць матэрыялы другой паловы XX ст., абавязкі святара магла выконваць і жанчына. Архіўныя крыніцы сведчаць аб тым, што за парушэнне заканадаўства аб рэлігійных культах у 1986 г. былі пакараны С.А. Аляксееў (Друя) і Е.І. Ануфрыева (Грыгараўшчына), якія праводзілі ў сваіх дамах богаслужэнні і выконвалі іншыя рэлігійныя абрады: "За нарушение законодательства о религиозных культах в 1986 г. наказаны административной комиссией следующие граждане: 1. Алексеев Савва Арсеньевич (старообр.) за нарушение законодательства о религиозных культах, выразившиеся в сборе верующих и устройстве молебнов в своем доме, а также в выдаче себя за священника не имея регистрационной справки и совершение религиозных обрядов по домам. Постановлением административной комиссии гр. Алексеев С.А. предупрежден. 2. Ануфриева Евдокия Ивановна (старообр., Григоровщина Козьянский с/с) за нарушение законодательства о религиозных культах, выразившиеся в сборе верующих в своем доме и устраивания молебна, за что имела денежное вознограждение. Постановлением административной комисси предупрежджена" [21, арк. 29].

Вышэй прыведзены прыклад з в. Грыгараўшчына Браслаўскага раёна, дзе абавязкі святара выконвала жанчына, – не адзінкавы для рэгіёна. У другой палове XX – пачатку XXI ст. такія выпадкі хоць і не з'яўляюцца распаўсюджанымі, але раз-пораз фіксуюцца. Часцей яны сустракаюцца ва ўсходняй частцы Віцебскай вобласці, дзе з сярэдзіны XX ст. працягвалі легальную працу толькі дзве стараверскія абшчыны. Пра традыцыю "папавання" (г.зн. выкананне абавязкаў святара) у г.п. Шуміліна, вв. Забор'е і Мяхі Шумілінскага раёна згадваў даследчык стараверства У. Іваноў. Як вынікае з яго матэрыялаў, у гэтай мясцовасці жаночае стараверскае святарства існавала не толькі ў другой палове XX ст., але фіксавалася яшчэ ў 2000-я гг. [7, с. 34]. Для Шуміліншчыны гэта цалкам зразумелая сітуацыя, паколькі легальная дзейнасць усіх стараверскіх абшчын на тэрыторыі раёна (у той час раён называўся Сіроцінскім) спынілася яшчэ ў канцы 1940-х гг. [12, с. 80]. Варта адзначыць, што на сучасным этапе такая практыка не супярэчыць кананічнаму праву паморскай царквы ў Беларусі. Згодна з "Положением о полномочиях церковнослужителей Древлеправославной Поморской Церкви в Республике Беларусь", такія сітуацыі цалкам магчымыя: "В случае отсутствия кандидата мужчины, соборной службой временно может руководить, в качестве уставщика, вдовица или девица или старица, как исключение, по крайней нужде"[2].

Архіўныя матэрыялы другой паловы 1980-х гг. утрымліваюць значную колькасць даных, якія характарызуюць стан стараверскіх абшчын вобласці. Як і ў мінулыя перыяды, у дакументах Савета па справах рэлігій і раённых органаў улады даволі часта адзначалася, што стараверскія рэлігійныя аб'яднанні вобласці пераважна малаколькасныя, знаходзяцца ў даволі дрэнным стане, а іх дзейнасць "затухае". Нават характарыстыка стараверскай абшчыны г. Віцебска, адной з самых вялікіх у рэгіёне, у 1986 г. прадстаўлена ў такім жа ключы: "Старообрядческая церковь в настоящее время переживает серьезные кризисные явления. Старообрядческую церковь можно отнести к общине с устойчивой тенденцией к затуханию" [21, арк. 147]. Што датычылася сельскіх абшчын, то яны характарызаваліся яшчэ больш негатыўна. У дакументах за 1986 г. сустракаем наступную характарыстыку абшчыны ў в. Ластавічы Глыбоцкага раёна: "Ластовичская церковь находится в упадке. Службы бывают только лишь в наиболее почитаемые религиозные праздники. Очень неграмотные священник и члены исполнительного органа, не могут даже отчет составить" [21, арк. 165]. Падобная ж характарыстыка датычылася Куклянскай і Апідамскай абшчын Пастаўскага раёна: "В стадии затухания деятельность Апидамской и Куклянской старообрядческой церквей. Посещают церкви в основном люди преклонного возраста. В 1986 г. в данных церквях не было венчаний, а в Апидамской – крещений. Дух. наставник Куклянской церкви Ситников А.П. имеет преклонный возраст, проживает в Поставах, поэтому моленья происходят только по большим религиозным праздникам" [21, арк. 132]. А ў адносінах стараверскай абшчыны ў в. Кірыліна Браслаўскага раёна ў 1985 г. увогуле адзначалася, што яна ў хуткім часе спыніць сваё існаванне: "Религиозное объединение идет на затухание и закрытие, и незначительное имущество будет передано другой церкви" [22, арк. 32].

У той жа час у архіўных дакументах некалькі лепш характарызуецца стан стараверскіх абшчын вялікіх гарадоў рэгіёна – Полацка і Віцебска. Пры гэтым трэба адзначыць, што і іх дзейнасць з боку мясцовых арганаў улады і ўпаўнаважаных Савета па справах рэлігій ацэньвалася неадназначна. З аднаго боку, у 1986 г. Полацкая стараверская абшчына характарызавалася не дужа пазітыўна: "В состав старообрядческой общины входят пенсионеры, возраст которых в подавляющем большинстве старше за 60 лет. Наблюдается снижение численности объединения в связи с тем, что старые люди умирают, а новыми община не пополняется. Старообрядцы не проявляют особой активности и в проведении религиозных обрядов" [21, арк. 128]. Але ў адносінах да яе за той жа год сустракаецца і наступная характарыстыка: "Старообрядческую церковь в г. Полоцке по сравнению с сельскими

[2] Вестник Центрального Совета Древлеправославной Поморской Церкви в Республике Беларусь. – 2009. – № 6. – С.11.

старообрядческими общинами еще, как говорится, нельзя списывать со счета” [17, арк. 15]. Як было адзначана вышэй, “тэндэнцыі да затухання” бачыліся ўпаўнаважанаму Савета па справах рэлігій і ў дзейнасці рэлігійнага аб’яднання старавераў-беспапоўцаў Віцебска, але з іншага боку, у тагачасных дакументах Савета пастаянна адзначалася масавае наведванне Віцебскага храма на вялікія святы, а самі богаслужэнні апісваліся вельмі ўрачыстымі. Так, на Пасху 1986 г. у царкве прысутнічала больш 1 тыс. чалавек [17, арк. 22]. Пра наведванне стараверскага храма ў Віцебску на Пасху 1988 г. звыш тысячы вернікаў таксама паведамляюць архіўныя крыніцы [23, арк. 11].

Аналізуючы архіўныя крыніцы і матэрыялы палявых даследаванняў, варта ўсё ж адзначыць некаторае “затуханне” ў 1980-я гг. у дзейнасці сельскіх стараверскіх абшчын рэгіёна (у першую чаргу, у выніку міграцыйных працэсаў). Пра гэта сведчаць і матэрыялы сацыялагічных даследаванняў, праведзеныя ў 1984–1987 гг. [3, с. 46–54]. Такую сітуацыю адзначалі і самі старaверы рэгіёна. Так, у 1986 г. духоўны настаўнік Кублішчанскай абшчыны М.Ф. Папкоў адзначаў: “На нас, стариках и старухах, кончится век нашей церкви. Богослужения проводятся только по большим праздникам, в воскресенье церковь закрыта. Детей и молодежи в церкви почти нет. За последние пять лет нет ни одного крещения, зато часто пгребения. Многие мои прихожане почти не соблюдают постов, раньше постили больше – ведь жили беднее, а теперь какие посты – когда в магазинах можно купить любые продукты” [17, арк. 73]. Але пры гэтым трэба ўсё ж адзначыць схематызм і тэндэнцыйнасць ў апісанні стану стараверскіх абшчын рэгіёна з боку органаў мясцовай улады і Савета па справах рэлігій. Тым больш у дакументах другой паловы 1980-х гг. сустракаюцца ўпамінанні пра ажыўленне дзейнасці абшчын, звязанае з палітыкай перабудовы. Так, стан стараверскай царквы па Віцебскай вобласці ў 1986 г. характарызаваўся ўжо больш пазітыўна, у параўнанні з мінулым перыядам: “Наблюдения свидетельствуют, что в 1986 г. несколько оживилась и старообрядческая церковь, хотя она за последние 10 лет имеет тенденцию к затуханию. Так, на Пасху 1986 г. в церквях было 3 085 чел. против 2 118 в 1985 г.” [17, арк. 91].

У такой сітуацыі з разнароднымі па характары дакументамі даволі складаным з’яўляецца вызначэнне колькасці вернікаў у стараверскіх рэлігійных аб’яднаннях рэгіёна. Як і ў мінулыя перыяды (гл. падрабязна: [10; 11; 12]), у афіцыйнай статыстыцы другой паловы 1980-х гг. за агульную колькасць прыхажанаў у абшчынах часцей прымаліся лічбы наведвання храмаў у важнейшыя святы (пераважна на Пасху). У архіўных дакументах другой паловы 1980-х гг. сустракаюцца наступныя даныя. У 1985 г. па Віцебскай вобласці стараверскія храмы на Пасху наведалі 2 118 вернікаў, у 1986 г. – 3 085 (гл. вышэй), у 1987 г. – 2 735, у 1988 г. – 2 517 [23, арк. 18]. Павярхоўны аналіз дадзенай інфармацыі будзе сведчыць аб істотным павелічэнні колькасці вернікаў у 1986 г. і іх паступовым памяншэнні ў наступныя гады. Але больш пільны аналіз гэтых даных паказвае іх умоўнасць. Як вынікае з матэрыялаў, Віцебскую стараверскую царкву на Пасху 1986 г. і 1988 г. наведала звыш тысячы вернікаў (гл. вышэй). Але ў той жа час у іншых архіўных дакументах сустракаюцца другія лічбы. Так, згодна з імі на Пасху 1986 г. у Віцебскім храме прысутнічала толькі 250 чалавек (па даных назірання) [21, арк. 9]. Роўна такая ж колькасць вернікаў (250) была зафіксавана і на Пасху ў Віцебскім храме ў 1988 г. [23, арк. 38]. Такім чынам, нават на аснове даных па адной абшчыне рэгіёна бачым сур’ёзныя разыходжанні ў розных дакументах, якія паходзяць з адной і той жа ўстановы (Савета па справах рэлігій). Тое ж назіраецца і пры падліках вернікаў з іншых абшчын. Так, згодна з адным дакументам, у Полацкай маленнай на Пасху 1988 г. прысутнічала толькі 50 чалавек, а ў іншым дакуменце гаворка ідзе ўжо пра 105 чалавек [23, арк. 11, арк. 48].

Разам з тым, умоўнасць такога спосабу падліку колькасці вернікаў (па наведваннях храма) падмацоўваецца і тым фактам, што ў некаторых храмах рэгіёна богаслужэнні на вялікія святы па пэўных прычынах маглі не праводзіцца, а таму ў афіцыйнай статыстыцы агульная колькасць вернікаў-старавераў па Віцебскай вобласці прадстаўлялася без іх уліку. Так, у 1986 г. на Пасху у Кірылінскай царкве службы не было [17, арк. 22]. А на Пасху 1988 г. богаслужэнні не адбываліся ў той жа Кірылінскай царкве, а таксама ў Булавішскай. У Кірылінай абшчыне ўвогуле на той час не было святара, а ў Булавішскай святар захварэў [23, арк. 31].

Нягледзячы на пачатак перабудовы ў СССР, у сярэдзіне 1980-х гг. стаўленне да рэлігійных абшчын мала змянілася. Па-ранейшаму існаваў строгі кантроль за выкананнем стараверскімі рэлігійнымі аб’яднаннямі і іх святарамі заканадаўства аб культах. У архіўных дакументах другой паловы 1980-х гг. даволі часта сустракаюцца ўпамінанні аб парушэннях з боку духоўных настаўнікаў гэтага заканадаўства. Асабліва гэта датычылася перыяду 1985–1987 гг., у наступныя гады такіх фактаў фіксавалася значна менш. Памяншэнне парушэнняў, як можна меркаваць, было абумоўлена істотнай зменай дзяржаўнага курсу ў пытаннях рэлігіі і царквы, якая адбылася ў 1988 г. Як было адзначана вышэй, за нелегальнае правядзенне ў сваіх дамах богаслужэнняў у 1986 г. былі пакараны С.А. Аляксееў (Друя) і Е.І. Ануфрыева (Грыгараўшчына), а згодна з інфармацыяй на 1986 г., святар Ластавіцкай стараверскай царквы І.П. Палавінчыкаў “отпевает умерших на дому, а деньги за совершаемые обряды присваивает” [17, арк. 51]. За 1987 г. адзначалася, што адсутнічаў сістэматычны кантроль дзейнасці святара Варонкаўскай стараверскай царквы, у выніку чаго: “он допускает нарушения законодательства о религиозных культах, совершая религиозные обряды в населенных пунктах Браславского района” [21, арк. 124].

Як ужо было адзначана вышэй, у 1990 г. колькасць стараверскіх абшчын у Віцебскай вобласці заставалася той жа (14), як і ў папярэднім дзесяцігоддзі. Па краіне у гэты ж год іх налічвалася 22, але дзейнічала толькі 19 [19, арк. 3]. Ужо з пачатку 1990-х гг. афіцыйнае афармленне пачынаюць атрымліваць новыя рэлігійныя аб’яднанні старавераў. Як было адзначана вышэй, у 1991 г. атрымала рэгістрацыю абшчына старавераў-папоўцаў у Віцебску. Хадайніцтва аб рэгістрацыі абшчыны было ўзбуджана яшчэ ў 1988 г.

Але сапраўдныя змены ў рэлігійным ландшафце вобласці былі выкліканы атрыманнем Беларуссю незалежнасці і прыняццем новага заканадаўства, якое рэгламентавала дзейнасць рэлігійных абшчын. У 1992 г. з'явіўся Закон "Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях". Ён карэнным чынам змяніў прававыя аспекты дзейнасці рэлігійных арганізацый. Калі савецкае заканадаўства не дазваляла рэлігійную дзейнасць без рэгістрацыі абшчыны, то новае беларускае заканадаўства вызначала рэгістрацыю толькі іх статутаў для атрымання правоў юрыдычнай асобы. З гэтай прычына рэлігійныя абшчыны маглі ўтварацца і дзейнічаць нават без рэгістрацыі статута [4, с. 318–319].

Пасля прыняцця новага заканадаўства ў рэгіёне ўзрастае колькасць стараверскіх рэлігійных арганізацый. Так, у 1992 г. па Браслаўскім раёне функцыянавала ўжо 5 абшчын. Апроч раней дзеючых (Булавішская, Відзаўская, Кірылінская, Мінкавіцкая) у дакументах ужо згадваецца і рэлігійнае аб'яднанне старавераў у в. Буеўшчына [24, арк. 11, 14]. Гэтая абшчына вядзе сваю гісторыю з другой паловы XIX ст., аднак пасля Вялікай Айчыннай вайны не прайшла афіцыйную рэгістрацыю і дзейнічала нелегальна [10, с. 89–91]. У 1994 г. афіцыйнае афармленне атрымала абшчына ў Друі, якая таксама з пачатку 1950-х гг. дзейнічала нелегальна. У 1995 г. аднавіла сваю працу і Мікалаюнцаўская абшчына ў Браслаўскім раёне, якая была знята з афіцыйнага ўліку ў 1969 г. (гл. вышэй) [25, арк. 62]. Калі ўсе вышэйпрыведзеныя абшчыны былі раней дзеючымі і толькі аднавілі сваю легальную працу, то стараверскае рэлігійнае аб'яднанне ў Браславе, якое пачало працу ў 1995 г., раней не існавала. Гістарычна г. Браслаў з'яўляецца адным з ранніх цэнтраў стараверства на паўночнабеларускіх землях, але абшчыны тут ніколі не было. Стараверскае рэлігійнае аб'яднанне ў Браславе ў 1995 г. атрымала ад горада памяшканне былой ветлячэбніцы для пераабсталявання ў маленную. Асвячэнне гэтага храма адбылося ў 1997 г.[3] Яшчэ адна стараверская абшчына паўстала ў Віцебску. Гэта абшчына Рускай Дрэўлеправаслаўнай царквы. У Віцебску на сучасным этапе існуе храм і абшчына РДЦ у гонар Свяціцеля Ніколы. У 2015 г. яе наведаў патрыярх РДЦ Аляксандр (Калінін), асвяціў храм і адслужыў першую літургію[4].

Трэба адзначыць, што стараверскія абшчыны Віцебскай вобласці ў першыя гады пасля прыняцця закона "Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях" не імкнуліся да афіцыйнай рэгістрацыі сваіх статутаў і даволі позна, у параўнанні з іншымі рэлігійнымі аб'яднаннямі, прыступілі да яе. На гэтую акалічнасць пастаянна звярталі ўвагу органы мясцовай улады, пры гэтым адзначаючы, што ніякіх абмежаванняў у дзейнасці абшчын, якія не зарэгістравалі свае статуты, не было. Так, па інфармацыі на 1992 г. па Міёрскім раёне адзначалася наступная сітуацыя: "Пока не зарегистрированы уставы старообрядческих общин <…> Хотя уставы названных религиозных организаций пока и не зарегистрированы, никаких ограничений на их деятельность никто не накладывал, они пользуются своими правами наравне со всеми остальными общинами" [24, арк. 42].

Як вынікае з аналізу архіўных дакументаў, большасць стараверскіх рэлігійных аб'яднанняў рэгіёна яшчэ да 1996 г. так і не зарэгістравалі свае статуты. У якасці прычын у дакументах адзначаліся розныя абставіны. Так, абшчыны ў Кублішчыне і Ніўніках Міёрскага раёна не былі зарэгістраваныя належным чынам яшчэ ў 1994 г. Прычынай гэтага, па меркаванні міёрскіх улад, была "слабасць" абшчын: "Остались незарегистрированными Уставы только старообрядческих общин. По сути дела это отмирающие объединения, представленные глубокими стариками и одним больным престарелым духовным наставником, которые просто не в состоянии решать вопросы регистрации" [27, арк. 63]. Аднак, як сведчаць крыніцы, ужо ў 1995 г. Кублішчанская абшчына прыступіла да вырашэння гэтага пытання, у той жа час Ніўнікаўская з-за смерці святара яго не вырашала: "В настоящее время [на 10.01.1995 г. – *А.У.*] одна из них (Кублищенская старообрядческая церковь) готовит документы для регистрации, вторая же (Нивникская старообрядческая церковь) к этому пока не готова. Здесь в 1994 г. умерли духовный наставник, некоторые члены приходского совета, оставшиеся старики, представляющие общину, просто не в состоянии решать данный вопрос – по сути дела это отмирающая община" [25, арк. 40]. Дакументы на рэгістрацыю Кублішчанскай абшчыны былі накіраваны толькі ў канцы 1995 г. [26, арк. 47].

Як можна меркаваць з матэрыялаў апытання духоўных настаўнікаў і аналізу архіўных крыніц, запазданне з рэгістрацыяй статутаў было абумоўлена адсутнасцю "арганізацыйнага цэнтра" на тэрыторыі Беларусі. Справа ў тым, што абсалютная большасць стараверскіх абшчын Віцебскай вобласці былі беспапоўскімі. У другой палове XX ст. у якасці духоўнага і арганізацыйнага цэнтра ўсіх гэтых абшчын выступаў Вышэйшы стараверскі савет, які знаходзіўся ў Вільні. І да канца 1980-х гг. ён апекаваўся беспапоўскімі абшчынамі на тэрыторыі Беларусі. Сувязі беларускіх ставерскіх абшчын з ім захоўваліся і ў 1990-я гг., аднак той ужо не меў ранейшага значэння і ўплыву, таму разрозненыя і малакалькасныя беспапоўскія стараверскія абшчыны рэгіёна доўгі час не маглі вырашыць пытанні падрыхтоўкі і рэгістрацыі статутаў. На гэтую асаблівасць звяртаў увагу яшчэ ў 1992 г. Шаркаўшчынскі райвыканкам, вызначаючы прычыны адсутнасці рэгістрацыі ў стараверскіх абшчын: "Все общины, за исключением трех старообрядческих, зарегистрировали в установленном порядке свои уставы. Основной причиной не предоставления на регистрацию уставов старообрядческих религиозных организаций является то, что ими слабо осуществляется руководство религиозным центром, который в настоящее время находится в Вильнюсе. Эти религиозные организации пока не выроботали единого основополагающего направления уставных требований. К тому же, они являются наиболее малочисленными по количеству своих членов и возраст верующих, состоящих в них, наиболее преклонный" [24, арк. 33].

[3] Храм Покрова Пресвятой Богородицы. Браслав. – URL: https://ruvera.ru/commune/hram_pokrova_presvyatoiy_bogorodicy_braslav.
[4] Приходы РДЦ в Беларуси. – URL: https://belstarover.org/parishes/.

Актывізацыя стараверскай царквы ў рэгіёне ў 1990-я гг. увасобілася і ў будаўніцтве новых храмаў, а таксама рамонце існуючых. У 1994 г. было прынята рашэнне аб будаўніцтве стараверскага храма ў Полацку. Нягледзячы на тое, што ў другой палове XX ст. Полацкая стараверская абшчына была адной з самых вялікіх у рэгіёне, свайго храма яна не мела. Стараверская царква, пабудаваная ў Полацку ў пачатку XX ст., была моцна пашкоджана ў час Вялікай Айчыннай вайны. Пасля яе заканчэння паўразбураны храм яшчэ некаторы час выкарыстоўваўся вернікамі, але ў наступным быў разабраны і на яго месцы была пабудавана школа. Увесь наступны час стараверы горада мусілі арэндаваць жылы дом для правядзення богаслужэння. 28 жніўня 1998 г. Свята-Успенскі храм быў асвечаны[5]. У 2010-я гг. быў пабудаваны храм свяціцеля Ніколы ў Віцебску (абшчына РДЦ). З 2002 г. пачаўся капітальны рамонт (фактычна, перабудова) стараверскага храма ў Браславе, у выніку чаго ён стаў цагляным. Істотныя рамонтныя работы былі праведзены ў Кублішчанскім, Варонкаўскім і інш. храмах.



**Малюнак 1. – Стараверская Свята-Успенская царква ў г. Полацку (фота аўтара, 2021 г.)**

Значную ролю ў арганізацыі і актывізацыі дзейнасці стараверскіх беспапоўскіх рэлігійных аб’яднанняў на беларускіх землях адыграла ўтварэнне Цэнтральнага Савета Дрэўлеправаслаўнай Паморскай Царквы Рэспублікі Беларусь (ЦС ДПЦ РБ). Рашэнне аб яго арганізацыі было прынята на з’ездзе духоўных настаўнікаў, які адбыўся 11 кастрычніка 1998 г. у Кублішчанскім Свята-Троіцкім храме (Міёрскі раён). На ім прысутнічалі прадстаўнікі 15 беспапоўскіх абшчын Беларусі. На гэтым з’ездзе адбыўся ўстаноўчы сход ЦС і было абрана яго кіраўніцтва[6]. Так, старшынёй ЦС быў абраны Г.А. Карпаў (Браслаў), сустаршынёй – Г.А. Бучкін (Віцебск), адказным сакратаром – П.А. Арлоў (Полацк). Акрамя таго, на з’ездзе быў складзены статут ЦС ДПЦ РБ, а таксама прынята рашэнне аб скліканні Сабора ДПЦ [8, с. 227]. Першы Усебеларускі Сабор ДПЦ адбыўся 28 снежня 1998 г. у Полацкім Свята-Успенскім храме. На ім прысутнічалі прадстаўнікі больш чым 20 беспапоўскіх абшчын з Беларусі. На Саборы былі зацверджаны рашэнні з’езда духоўных настаўнікаў, створаны духоўны аддзел, рэвізійная камісія і канцылярыя. Былі таксама вызначаны асноўныя накірункі дзейнасці ЦС. На Другім Усебеларускім Саборы, які адбыўся 28 снежня 1999 г. у Полацку, старшынёй ЦС быў абраны П.А. Арлоў, які ўзначальваў яго да 2010 г. [8, с. 227]. З 2010 г. старшынёй ЦС стаў А.М. Бялоў, які яго ўзначальвае на сённяшні дзень. ЦС ДПЦ РБ уваходзіў у Міжнародны Савет ДПЦ, які ў 2001 г. быў пераўтвораны ў Адзіны Савет ДПЦ. У дзейнасці ЦС ДПЦ РБ вядучую ролю заўсёды адыгрывалі святары з Віцебшчыны.

Як вынікае з матэрыялаў, у 2000 г. на тэрыторыі Віцебскай вобласці налічвалася 20 стараверскіх абшчын. У той жа час, у Беларусі іх было 35 (табліца). Такім чынам, у гэты перыяд у межах вобласці было засяроджана больш паловы (57,14%) ад усёй колькасці стараверскіх рэлігійных аб’яднанняў краіны. Пры гэтым у заходняй частцы вобласці (Пастаўскі, Браслаўскі, Міёрскі, Глыбоцкі, Шаркаўшчынскі раёны) іх налічвалася 16, што скла-

[5] Орлов П.А. История Полоцка и его старообрядчества. – [Полоцк]: б.и. – 2008.
[6] У дакументах гэты з’езд якраз і фігуруе пад назвай “Першы ўсебеларускі Устаноўчы Сабор” (гл.: Вестник Центрального Совета Древлеправославной Поморской Церкви в Республике Беларусь. – 2008. – №5. – С. 12).

дала 45,71% ад усёй колькасці ў Беларусі. У 2003 г. іх лік у Віцебскай вобласці зменшыўся да 18. Такая іх колькасць (18) заставалася стабільнай на працягу наступных двух дзесяцігоддзяў (гл. табліцу). Паказальна, што ў гэты перыяд на тэрыторыі Віцебскай вобласці скарацілася колькасць толькі стараверскіх і мусульманскіх (з 5 да 4) абшчын. У сваю чаргу, колькасць рэлігійных арганізацый іншых канфесій у гэтыя гады расла [5, с. 175]. На сучасным этапе на тэрыторыі Віцебскай вобласці афіцыйна дзейнічаюць 18 рэлігійных аб'яднанняў стараевераў. З іх 17 адносяцца да ДПЦ, 1 – да РДЦ (малюнак 2). Такім чынам, па-ранейшаму ў рэгіёне дамінуюць беспапоўскія стараверскія абшчыны.

Табліца 1. – Колькасць стараверскіх абшчын на тэрыторыі Віцебскай вобласці (1988–2024 гг.)

| Рэгіён | Колькасць абшчын па гадах | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1988 | 1990 | 2000 | 2010 | 2020 | 2024 |
| Віцебская вобласць | 14 | 14 | 20 | 18 | 18 | 18 |
| Усяго па краіне | 22 | 22 | 35 | 32 | 34 | 34 |

Складзена на аснове: [18, арк. 25; 19, арк. 3; 28; 6, с.141, с. 145].

Аналізуючы статыстычныя даныя, варта адзначыць, што з канца 1980-х гг. па канец 1990-х гг. колькасць стараверскіх абшчын у Беларусі вырасла больш чым на палову. Так, калі ў 1988 г. іх налічвалася 22, то ў 1999 г. іх стала 36 [6, с. 141]. Пры гэтым іх рост (з 14 да 18) у Віцебскай вобласці за гэты час не быў такім істотным (менш чым на 30%). Калі прыняць да ўвагі той факт, што большасць з гэтых "новаўтвораных" абшчын на тэрыторыі вобласці ў 1990-я гг. толькі афіцыйна легалізавалі сваю дзейнасць, то павелічэння фактычна не адбылося. Такім чынам, дзеючыя нелегальна ў другой палове XX ст. рэлігійныя аб'яднанні ў 1990-я гг. змаглі афіцыйна афарміць сваю працу. У сваю чаргу, павелічэнне стараверскіх абшчын у іншых рэгіёнах Беларусі было куды больш істотным. Без уліку Віцебскай вобласці, колькасць стараверскіх абшчын з канца 1980-х па канец 1990-х узрасла амаль у два разы (з 8-мі у 1988 г. да 15-ці у 2000 г.). У наступныя два дзесяцігоддзі іх колькасць заставалася адносна стабільнай. Звяртае на сябе ўвагу і той факт, што амаль усе (за выключэннем Віцебска) стараверскія абшчыны Віцебскай вобласці, якія ў 1990-я гг. былі ўтвораны або аднавілі сваю легальную дзейнасць, размяшчаюцца ў заходняй яе частцы. Ва ўсходніх раёнах вобласці з вялікай канцэнтрацыяй стараверскага насельніцтва (Шумілінскі, Чашніцкі, Бешанковіцкі раёны) і дзе адразу пасля Вялікай Айчыннай вайны дзейнічала значная колькасць абшчын, у 1990 – 2020-я гг. стараверскія рэлігійныя аб'яднанні так і не аднавілі сваю дзейнасць.




**Цэнтры абшчын:**
*Пастаўскі раён:* 1. Апідамы.
*Браслаўскі раён*: 2. Відзы, 3. Мінкавічы, 4. Мікалаюнцы, 5. Булавішкі, 6. Браслаў, 7. Буеўшчына, 8. Кірыліна, 9. Друя.
*Міёрскі раён:* 10. Ніўнікі, 11. Кублішчына.
*Шаркаўшчынскі раён:* 12. Варонка, 13. Шаркаўшчына, 14. Германавічы.
*Глыбоцкі раён:* 15. Ластавічы.
16. Полацк. 17. Віцебск (ДПЦ). 18. Віцебск (РДЦ).

**Малюнак 2. – Стараверскія абшчыны на тэрыторыі Віцебскай вобласці на сучасным этапе**

Нягледзячы на тое, што на сучасным этапе ў рэгіёне налічваецца афіцыйна 18 стараверскіх абшчын, не ўсе яны ў роўнай ступені праяўляюць сваю дзейнасць. Так, калі ў стараверскіх храмах у Віцебску, Полацку, Шаркаўшчыне, Браславе, Кублішчане, Відзах рэгулярна праводзяцца богаслужэнні, то ў шэрагу невялікіх сельскіх абшчынах Заходняй Віцебшчыны яны адбываюцца толькі ў вялікія гадавыя святы. Некаторыя рэлігійныя аб'яднанні на сучасным этапе не маюць сваіх духоўных настаўнікаў (вв. Мінкавічы, Мікалаюнцы, Булавішкі, Буеўшчына, Кірыліна, Ніўнікі, Друя, Германавічы, Апідамы). Імі апякуюцца святары з суседніх стараверскіх абшчын рэгіёна.

**Заключэнне.** Такім чынам, на аснове аналізу матэрыялаў прыходзім да наступных высноў. У сярэдзіне 1980-х гг. на тэрыторыі Віцебскай вобласці функцыянавала значная колькасць стараверскіх абшчын. Афіцыйна зарэгістраванымі былі 14, шэраг дзейнічала таксама нелегальна. Палітыка перабудовы, якая пачалася ў сярэдзіне 1980-х гг. і выклікала дэмакратызацыю дзяржаўна-канфесійных адносін у СССР, напачатку мала закранула стараверскія абшчыны рэгіёна. Па-ранейшаму адсочвалася іх дзейнасць, асабліва ў плане выканання заканадаўства аб культах. Найбольш сур'ёзна сітуацыя змянілася ўжо ў пачатку 1990-х гг. з атрыманнем Беларуссю незалежнасці і прыняццем новага заканадаўства, якое рэгламентавала дзейнасць рэлігійных арганізацый. Гэта дазволіла шэрагу стараверскіх абшчын легалізаваць сваё становішча, а таксама ўтварыць новыя. Ужо ў 2000 г. на тэрыторыі вобласці афіцыйную рэгістрацыю прайшлі 20 абшчын. Аднак у 2003 г. іх лік зменшыўся да 18. Такая колькасць афіцыйна зарэгістраваных стараверскіх рэлігійных аб'яднанняў на тэрыторыі Віцебскай вобласці застаецца стабільнай да нашага часу. Паказальна, што большасць абшчын размяшчаецца ў заходняй частцы Віцебшчыны (15), што абумоўлена канфесійнай палітыкай на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы ў міжваенны перыяд, а таксама спецыфікай дзяржаўна-рэлігійных адносін у рэгіёне ў сярэдзіне 1940-х – 1980-х гг. У выніку, на сучасным этапе стараверскія абшчыны Заходняй Віцебшчыны складаюць каля паловы (44,12%) ад усёй колькасці па Беларусі. Аднак не ўсе яны на сучасным этапе актыўна праяўляюць сваю дзейнасць. Шэраг сельскіх абшчын на захадзе рэгіёна малаколькасныя, а богаслужэнні адбываюцца ў іх толькі па вялікіх гадавых святах. Некаторыя з іх не маюць сваіх духоўных настаўнікаў.

## ЛІТАРАТУРА


1. Аўсейчык У.Я. Стараверы Беларусі ў 1830–1860-я гг.: тэрыторыя рассялення і колькасны склад // Беларускі гістарычны часопіс. – 2022. – № 11. – С. 10–17.
2. Аўсейчык У.Я. Гісторыя вывучэння старавераў Паўночнай Беларусі // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуман. науки. – 2020. – № 1. – С. 18–32.
3. Короткая Т.П., Прокошина Е.С., Чудникова А.А. Старообрядчество в Беларуси. – Минск: Навука і тэхніка, 1992. – 115 с.
4. Канфесіі на Беларусі (к.XVIII–XX ст.) / В.В. Грыгор'ева, У.М. Завальнюк, У.І. Навіцкі, А.М. Філатава. – Мінск: Экаперспектыва, 1998. – 340 с.
5. Старостенко В.В. Специфика конфессиональной структуры Витебской области в контексте религиозной жизни Республики Беларусь // Романовские чтения-12: сб. ст. Междунар. науч. конф. / Под общ. ред. А.С. Мельниковой. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2017. – С. 175–176.
6. Старостенко В.В. Региональная структура старообрядчества в Восточной Беларуси в 2000-х гг.: особенности и динамика развития // Религия и общество-13: сб. науч. ст. / Под общ. ред. В.В. Старостенко, О.В. Дьяченко. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2019. – С. 141–146.
7. Іваноў У. Аб кабетах, якія «папуюць»: аб ролі і месцы жанчынаў у рэлігійным жыцці стараверства Віцебшчыны // Женщины в политике: новые подходы к политическому. Феминистский образовательный альманах. – Прага: Адліга, 2013. – Вып. 2. Личное как политическое. – С. 31–37.
8. Безгодов А.А. Поморское древлеправославие в Белоруссии (современный аспект развития) // Старообрядчество: история, культура, современность: Материалы VI Междунар. науч. конф., 19–20 нояб. 2020 г., Москва. – М., 2002. – С. 225–229.
9. Хурсан Т.І. Стараабраднікі Беларусі: мінулае і сучаснасць. – Мінск: Белар. навука, 2020. – 175 с.
10. Аўсейчык У.Я. Стараверскія абшчыны паўночна-заходняй Беларусі ў сярэдзіне 1940-х – 1950-я гг. // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуман. науки. – 2023. – № 2(67). – С. 86–93.
11. Аўсейчык У.Я. Стараверскія абшчыны Віцебскай вобласці ў 1960 – першай палове 1980-х гг. // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки: сб. науч. статей. – Минск: РИВШ, 2023. – Вып. 23, ч. 1: Исторические науки. – С. 11–19.
12. Аўсейчык У.Я. Стараверскія абшчыны Віцебскай вобласці ў 1945 – першай палове 1950-х гг. // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуман. науки. – 2023. – № 1. – С. 76–82.
13. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 151.
14. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 145.
15. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 29.
16. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 68.
17. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 5. Спр. 59.
18. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 5. Спр. 84.
19. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 5. Спр. 105.
20. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 152.
21. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 5. Спр. 58.
22. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 5. Спр. 53.

23. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 5. Спр. 79.
24. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 5. Спр. 119.
25. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 5. Спр. 126.
26. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 5. Спр. 128.
27. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 5. Спр. 122.
28. Сведения о количественном росте религиозных общин в Республике Беларусь (1996 – 2024 годы). [Электронный ресурс] – URL: https://belarus21.by/Articles/svedeniya-o-kolichestvennom-roste-religioznyh-obshhin-v-respublike-belarus-1996-2020-gody (дата обращения: 25.04.2024).

*Пастуniў 03.03.2024*

## СТАРООБРЯДЧЕСКИЕ ОБЩИНЫ ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ 1980-х – 2020-х гг.

***канд. ист. наук, доц. В.Е. ОВСЕЙЧИК***
***(Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой)***

*В статье характеризуется состояние старообрядческих общин на территории Витебской области во второй половине 1980-х – 2020-х гг. В этот период область являлась абсолютным лидером по количеству старообрядческих религиозных объединений в стране. В конфессиональной истории Беларуси середина 1980-х гг. отмечается оживлением религиозной жизни, которое было вызвано мероприятиями перестройки. Однако на деятельность старообрядческих объединений области эти процессы мало повлияли. В статье выявляются закономерности функционирования старообрядческих общин в регионе во второй половине 1980-х гг. Отмечаются особенности государственно-конфессиональных отношений в этот период. Более существенные изменения в религиозном ландшафте области были вызваны обретением Беларусью независимости и принятием нового законодательства, которое регламентировало деятельность религиозных общин. В работе показан процесс образования (регистрации) новых старообрядческих религиозных организаций в 1990-е гг., охарактеризовано их положение в 1990–2020-е гг., проанализированы количественные показатели.*

***Ключевые слова:*** *староверы, религиозная община, этническая группа, конфессия, Витебская область, государственно-конфессиональные отношения.*

## OLD BELIEVER COMMUNITIES OF VITEBSK REGION IN THE SECOND HALF OF 1980S – 2020S

***U. AUSEICHYK***
***(Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk)***

*The article characterizes the state of the Old Believer communities in the territory of Vitebsk region in the second half of the 1980s – 2020s. During this period the region was the absolute leader in the number of Old Believer religious associations in the country. In the confessional history of Belarus, the mid-1980s is marked by the revitalization of religious life, which was caused by perestroika measures. However, these processes had little impact on the activities of the Old Believers' associations of the region. The article reveals the regularities of functioning of the Old Believers' communities in the region in the second half of the 1980s. The peculiarities of state-confessional relations in this period are noted. More significant changes in the religious landscape of the region were caused by the independence of Belarus and the adoption of new legislation that regulated the activities of religious communities. The paper shows the process of formation (registration) of new Old Believer religious organizations in the 1990s, characterizes their situation in the 1990 – 2020s, and analyzes quantitative indicators.*

***Keywords:*** *Old Believers, religious community, ethnic group, confession, Vitebsk region, state-confessional relations.*